ЗАЦВЕРДЖАНА

Намеснік старшыні
аргкамітэта заключнага этапа
рэспубліканскай алімпіяды

К.С. Фарыно

“__” сакавіка 2012 г.

# Рэспубліканская алімпіяда па гісторыі 2012 г.
# Заключны этап.

**10 клас**

1 тур

Паважаныя ўдзельнікі алімпіяды!
Вам прапанаваны тэарэтычныя заданні, на якія вы павінны даць разгорнуты і падрабязны адказ.
Жадаем вам поспехаў!

**1. Уважліва разглядзіце малюнак.
Адкажыце на пытанні**

*Заданне выконваецца
ў сшытку*



1. *Якая падзея прадстаўлена на малюнку і хто яго аўтар?*
2. *Калі яна адбылася?*
3. *Дзе яна адбылася?*
4. *З імёнамі якіх гістарычных асобаў звязана гэтая падзея?*
5. *Якія наступствы гэтай падзеі?*
6. *У якіх літаратурных творах адлюстравана гэтая падзея?*

**2. Запоўніце табліцу “Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі пад час вайны 1812 г. напалеонаўскай Францыі і Расійскай імперыі”**

*Заданне выконваецца на бланку*

| Дата | Месца ваенных дзеянняў | Ход падзей | Наступствы |
|---|---|---|---|
| 12 чэрвеня | | | Адступленне 1-ай і 2-ой расійскіх армій |
| 9-11 ліпеня | | Корпус генерала М.М. Раеўскага прыкрыў адступленне рускіх армій | |
| 18-20 ліпеня | Бітва пад Клясціцамі | | |
| 19 кастрычніка | | Перамога рускіх войскаў над атступаючымі з-пад Полацка французамі | |
| 14-16 лістапада | | | |

**3. Уважліва разглядзіце фотаздымак і адкажыце на пытанні**

*Заданне выконваецца ў сшытку*



*1. Якая падзея адлюстравана на дадзеным фотаздымку?*

*2. Якая падзея, звязаная з дадзеным транспартным сродкам, адбылася на наступны дзень?*

*3. Як называўся план ваеннай кампаніі, які папярэднічаў гэтай падзеі? І якія былі ўмовы пагаднення, падпісаныя ў дадзеным транспартным сродку?*

*4. Хто той генерал адной з краін- удзельніц падпісання, які выступіў супраць гэтага пагаднення? Якую арганізацыю ён стварыў у будучым?*

*5. Якая гістарычная падзея і калі адбылася ў гэтым транспартным сродку ў мінулым?*

**4. Прачытайце ўрывак з гістарычнай крыніцы і адкажыце на пытанні**

*Заданне выконваецца ў сшытку*

“Калі развіццё падзей прымушае які-небудзь народ парваць палітычную сувязь, якая злучае яго з іншым народам, і заняць нароўні з іншымі дзяржавамі незалежнае становішча, на якое яму даюць права натуральныя і Божыя законы, - гэтая належная павага на думку чалавецтва абавязвае яго выказаць прычыны, што заахвочваюць да аддзялення. Мы лічым відавочным наступныя законы: усе людзі створаны роўнымі, і ўсе яны адораны сваім Стваральнікам некаторымі неадчужальнымі правамі, да ліку якіх належаць жыццё, воля і імкненне да

шчасця. Для забеспячэння гэтых правоў створаны сярод людзей урады, якія пазычаюць сваю справядлівую ўладу са згоды тых, кім кіруюць. Калі ж дадзеная форма ўрада знішчае гэтую мэту, то народ мае права змяніць ці знішчыць яе і заснаваць новы ўрад, заснаваны на такіх прынцыпах і з такой арганізацыяй улады, якая, па меркаванню гэтага народа, больш усяго можа спрыяць яго бяспецы і шчасцю. Канешне, асцярожнасць раіць не змяняць урадаў, якія існуюць з даўніх часоў, з-за малаважных ці часовых прычын.

Гэтыя калоніі доўгі час праяўлялі цярплівасць, і толькі неабходнасць вымушае іх змяніць ппапярэднюю сістэму свайго ўрада".

1. *Як называецца гэты дакумент?*
2. *Калі і дзе ён быў прыняты?*
3. *Хто быў аўтарам праекту гэтага дакумента?*
4. *Якую пасаду надалей зойме гэты чалавек?*
5. *Што абвяшчаў гэты дакумент?*
6. *Якая падзея адбывалася ў момант прыняцця гэтага дакумента?*
7. *З кім жадаў разарваць сувязь аўтар дакумента?*
8. *Якія прапановы аўтара праекта не ўвайшлі ў канчатковы тэкст, але былі рэалізаваны праз многа гадоў?*

**5. Запоўніце табліцу «Рэакцыя ў краінах Азіі на каланіяльную палітыку еўрапейскіх дзяржаў у другой палове XIX – пачатку XX ст.»**

*Заданне выконваецца ў сшытку*
*(!) У выглядзе табліцы*

| Краіна | Змяненні ў палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сферах | Дзяржаўны статус на пачатак XX ст. |
|---|---|---|
| **Індыя** | | |
| **Кітай** | | |
| **Асманская імперыя** | | |
| **Японія** | | |

*Заданне выконваецца на бланку*

**6. Аднавіце генеалагічную структуру ўладароў Вялікага Княства Літоўскага XIV – першай паловы XVI ст.**

Уладары: **Альгерд, Аляксандр, Вітаўт, Гедымін, Жыгімонт Стары, Казімір, Кейстут, Свідрыгайла, Ягайла, Яўнут (Яўнуцій)**

